

## Літаратурны каляндар:

**6 лютага** 120 гадоў з дня нараджэння **Надзеі Давыдаўны Вольпін** (6.02.1900 – 9.09.1998), перакладчыцы, паэтэсы;

**25 лютага** 100 год з дня нараджэння паэта, перакладчыка **Пятра Фёдаравіча Прыходзькі** (25.02.1920 – 30.11.2006).

# Вершы пра Перамогу, родную зямлю і дзяцінства:

## магілёўскія пісьменнікі на Міжнароднай кніжнай выставе



**Магілёўскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, дзякуючы падтрымцы Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, штогод прымае ўдзел у Міжнароднай кніжнай выставе ў горадзе Мінску.**

7 лютага бягучага года магілёўскія пісьменнікі прапанавалі жыхарам і гасцям сталіцы – наведвальнікам выставы – паэтычную праграму «Крылаў неба бяскрайні размах». На пляцоўцы Саюза пісьменнікаў Беларусі магілёўцаў гасцінна сустрэла гаспадыня – першы намеснік старшыні СПБ Алена Анатольеўна Стэльмах. Падчас імпрэзы гучалі вершы, прысвечаныя 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Радзіме і... дзяцінству.

«Дзе цябе адшукаць, песня роднай зямлі...» – шчырымі радкамі пра Радзіму адкрыў прадстаўленне старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Мікалаевіч Казека.

Далей у выкананні юных артыстаў тэатральнай студыі «В точку!» ДУА «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў №1» прагучалі радкі з паэмы Алеся Казекі «Марыйка», вершы Валянціны Габрусевай «Пах Бацькаўшчыны», «Зіхаціце, зоркі», «Мая зямля».

Паэтка Вольга Бялова прачытала свой верш ваеннай тэматыкі «Хто тут пахаваны?». У яе выкананні прагучалі філасофскія вершы-роздумы Віктара Кунцэвіча, Сяргея Рынкевіча і Алеся Казекі.

Незвычайна быў прадстаўлены блок дзіцячых вершаў. Распачаўся ён вершам «Клубничное лето» Марыны Сліўко, пасля вызваў цікавасць чытачоў коткай, якая згодная з усім, каб прыманіць чалавека («Кошка готова на все, что угодно», Алена Кісель). А потым удзельнікі студыі «В точку!» разыгралі тэатральныя мініяцюры на вершы з кнігі Жанны Міус «Владушкины пальчики» і «Странные детки».

«Крылаў неба бяскрайні размах» – ляці! У добры шлях! Да наступнай Міжнароднай кніжнай выставы.

**Валянціна Фёдараўна ГАБРУСЕВА,** член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2017 года. Ганаровы грамадзянін Клічаўскага раёна.



Валянціна Фёдараўна актыўны ўдзельнік творчага жыцця Магілёўскага абласнога аддзялення СПБ. Праводзіць вялікую работу па патрыятычным і ідэйна-маральным выхаванні моладзі. Яна часты госць у навучальных установах і бібліятэках горада. Яе хвалюе лёс і прыгажосць роднага краю, яго гісторыя.

Валянціна Габрусева аўтар зборнікаў паэзіі «Журавінавыя гронкі» (2006), «Буслiны вальс» (2007), «Букет бяссмертнікаў» (2009), «Водар бацькаўшчыны» (2015), «Дзе пашчасціла мне нарадзіцца» (2016), «Блакіт жывой вады» (2020), «Мая зямля, мая Айчына» (2019, зборнік песень на беларускай мове), «Спаси и сохрани» (2020, зборнік песень на рускай мове).

У 2019 годзе на літаратурным конкурсе «Бацькаўшчына светлая мая», арганізаваным Выдавецкім домам «Звязда», часопісам «Маладосць» і Першым нацыянальным каналам беларускага радыё, Валянціна Габрусева атрымала Дыплом II ступені.

На вершы Валянціны Габрусевай напісана больш за 200 песень, якія выконваюць Мінскі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі, салісты Магілёўскай абласной філармоніі, Магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і іншыя. З'яўляецца лаўрэатам міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і гарадскіх фэстаў аўтарскай песні.

***

*Праз жах вайны, пякельныя пажары,*
*У горкасці нявыплаканых слёз,*
*Мой бацька, ідучы да светлай мары,*
*У падарунак мне цябе прынёс.*
*Той боль, які знаёмы ўсёй планеце,*
*Да свайго сэрца прытуліла я,*
*Адзіная ты для мяне на свеце,*
*Мая святая родная зямля.*
*Спявала ты сваю мне калыханку*
*Пад сонейка нязгаснага святло.*
*У чыстых росах трапяткіх світанкаў*
*Пад клёкат белых птушак над жытлом.*
*Матуў твой напяваю сваім дзецям,*
*Ён не змаўкае ў песнях салаўя,*
*Адзіная ты для мяне на свеце,*
*Зямля-матуля родная мая.*
*Я пакланюся роднай сваёй хаце,*
*Ля траў мурожных у святле бяроз,*
*Схілюся нізка перад бацькам з маці*
*За іх складаны і мой шчасны лёс,*
*Дзе ты стаіш іконай прад вачыма,*
*Якой штодзень малюся не здаля,*
*Мая святая малая радзіма,*
*Вялікая бясцэнная зямля.*

***

*І вокны, і дзверы вясне былі насцеж!*
*Ды дзе ж так было, каб злічыла да ста*
*Ў сваім паўнаводдзі зялёнае шчасце*
*Пад поручнем кволым макета маста?!*
*Адзін на дваіх небасхіл – таямніца*
*Спрадвечнаю сведкай сустрэч пад луной,*
*І з тонкай гаркотаю мёда суніцы,*
*Што мы смакавалі з паляны адной.*
*Пад ношай сумеснай адны былі плечы,*
*Ды што мае плечы? –*
*У кустах галава!*
*А вочы!*
*Ад гэткай бяздоннай сінечы*
*Здавалася, блёкла нябёс сіdespre!*
*У зацятым здранцвенні адна разразала*
*Я позіркам страх, калі падала ніц*
*Душа мая, што не пісала – прапала,*
*Як трапіла сэрца пад шквал бліскавіц.*
*Ды позна цяпер, што тады было рана,*
*А шчасце – яно недзе там, пад луной.*
*...Стаю на раллі, што не мною ўзарана,*
*І ў восень я сею, што сеюць вясной.*

## Віншуем з днём нараджэння:



**3 лютага – Барысенку Мікалая Сяргеевіча**
**10 лютага – Уласенку Міхаіла Аляксандравіча**
**14 лютага – Іскрова Леаніда Уладзіміравіча**
**22 лютага Малянкову-Куляшову Вольгу Сяргееўну**

## Віншуем з юбілеем

**5 лютага – Палітыку Афанасія Паўлавіча**
**26 лютага – Габрусеву Валянціну Фёдараўну**

# Яскравыя жамчужыны жыцця!



**Апанас Паўлавіч ПАЛІТЫКА** нарадзіўся 5 лютага 1935 г. у вёсцы Бродак Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Празаік, паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1981 года.

Літаратурную працу пачаў у 1960 годзе з вершаў на рускай мове. Свой першы верш апублікаваў у газеце «Магілёўская праўда». Яго празаічныя творы, апавяданні, аповесці адметныя грунтоўным веданнем жыцця, цёплым гумарам, вострай сацыяльнай накіраванасцю, непрымірымымі адносінамі да негатыўных з'яў, якія перашкаджаюць нам жыць. Першы зборнік твораў Апанаса Палітыкі выйшаў у 1976 годзе пад назвай «І ў хвост і ў грыву». Пасля гэтага былі «Маўчанне навыперадкі», «Свой хлопец», «Праверка». У сваім зборніку апавяданняў «Праверка» аўтар даследуе многія «язвы» нашага жыцця. Ён вядомы сваімі сатырычнымі творамі. Жыццё пісьменніка звязана з малой радзімай – Крычаўскай зямлёй, дзе і жыве ён сёння. Прапануем вашай увазе апавяданне «Нудная гісторыя» з яго кнігі «Маўчанне навыперадкі».

## «Нудная гісторыя»

Леў Іванавіч Самуйлёнак – заатэхнік. Прытым галоўны.

Ва ўпраўленні гавораць: «Таленавіты!» Ды вось бяда: рыбак ён. Сапраўдны. Праўда, ловіць не так ужо і шмат. Але паслухалі б вы, як ён расказвае аб якой-небудзь драбнюткай верхаводцы! Нібы аб жонцы-прыгажуні.

Дык вось... Туляецца ён па пакоі такі стройны, дужы, нібы той асілак, і неяк надта ўжо мітусліва збіраецца на рыбалку.

Справа тут вось у чым. Жонка яго, міленькая Анюта, даволі хутка адвучыла яго ад курэння і шахмат. А цяпер усю сваю кіпучую пяшчотную энергію накіроўвае супраць яго рыбацкага запалу.

Яна падыходзіць да яго ў такі момант з адным і тым жа пытаннем:

– Зноў?

І Леў Іванавіч ператураецца ў кацяня.

– Ну, міленькая...

– Я пытаюся – зноў?!

І рыбалка загінула.

Нарадзілася сварка.

Закончылася яна ўльтыматумам:

– Альбо – я, альбо – рыбалка!

Леў Іванавіч хацеў выбраць рыбалку. Вельмі хацеў.

Але зірнуў на трохгадовую Наташку... і не выбраў.

Доўга пасля гэтага ён сніў рэчкі, азёры, шчупакоў. Паступова заатэхнік прыйшоў да думкі, што ўсяму свой час. Ну, безумоўна, з'явілася звычка да сядзення, ляжання. Пасля ад Самуйлёнка падаўся добры сябар Апетыт. Ды яшчэ змяніў з сабой Добры Настрой.

У прыродзе пустаты не бывае. Неўзабаве на іх месца да яго прыйшло новае жаданне. Згубнае жаданне. «Зялёны змій»...

Задаволіць яго Леў Іванавіч як-небудзь, прымасціцца каля акна і глядзіць пасалавелымі вачыма, як яго сусед Мікалай Мікалаевіч завіхаецца каля сваіх рыбацкіх прылад. І сумна думае: «Вось чалавеку перавалiла ўжо за шосты дзясятак, а ён усё яшчэ рыбачыць. І лёгка яму ходзіцца... І вось... Не сумуецца». Успамінае сваё захапленне гэтай справай. Успамінае, як штосьці светлае. І наіўнае. Далёкае-далёкае.

А тут, аказваецца, Абыякавасць і Лянота даўно па пятах ходзяць. І вось ужо яны бяруць Льва Іванавіча за мяккія рукі і вядуць, вядуць... За годам год.

Сваркі працягваліся. У час іх высветлілася, што работу над дысертацыяй Леў Іванавіч кінуў, што ва ўпраўленні яму ўляпілі страгача і што наогул ён, Леў Іванавіч, важыць ужо ледзь не сто кілаграмаў.

Пастарэла і Анюта. Яна часта скардзілася суседцы:

– Я ж, ета, чаму за яго пайшла? Ну, думаю, спецыяліст ды яшчэ ў вучоныя вылез. А ён толькі жарэ ды п'е, жарэ ды п'е. Кажу: «Ты ж бы, як Мікола, стары гэты, хоць бы на рыбалку, ці што?» А ён: «Перахацелася!» Ой, як мне не пашанцавала... Ой-ой-ой!

**Літаратурную старонку падрыхтавалі: Алесь Казека і Святлана Казека.**